***Лабоха Г.М.***

# Роля Еўфрасінні Полацкай у дзяржаўнай палітыцы Полацкага княства

*Асветніцкая дзейнасць Еўфрасінні Полацкай (1104–1173) мела вялікае значэнне ў культурным жыцці не толькі тагачаснага Полацкага княства, але і наступных эпох у жыцці дзяржавы. Пад апекай полацкай ігуменні і пры яе фактычным удзеле быў закладзены падмурак для развіцця мясцовых мастацкіх традыцый у галінах літаратуры і бібліятэчнай справы, архітэктуры, жывапісу і прыкладнога мастацтва. Будучы шматвектарнай, дзейнасць Еўфрасінні не абмяжоўвалася пазначанымі напрамкамі. Пазначаны намі факт абумовіў раскрыццё асобы прападобнай і вызначэнне яе ролі ў грамадска-палітычным жыцці Полацкага княства.*

Еўфрасіння Полацкая (1104–1173) стала першай усходнеславянскай жанчынай, кананізаванай праваслаўнай царквой, і адзінай святой, прызнанай усімі хрысціянскімі канфесіямі. Так, полацкая княжна па ўласным жаданні і насуперак волі бацькоў абрала другі від жыццёвага шляху (акрамя замужжа). Адыход у манастыр азначаў парыванне сувязяў са знешнім светам, адрачэнне ад зямных клопатаў. Надзеўшы манаскі клабук, Еўфрасіння ў ідэале павінна была адысці ад усяго мірскога, каб дасягнуць духоўнай дасканаласці. Аднак парывання з мірскімі сувязямі не адбылося, у першую чаргу, па прычыне сацыяльнага паходжання Еўфрасінні.

Пачынаючы з дакастрычніцкай гістарыяграфіі, дзеянні прападобнай ігуменні разглядаліся выключна з пазіцыі кананічнага выкладання яе Жыція ў храналагічнай паслядоўнасці. Першыя спробы аналізу агіяграфічнай крыніцы насілі вузкаканфесіянальны характар. Так, працы Д. Даўгялы [**1**], М. Дуброўскага [**2**], А. Сапунова [**3**, **4**] абмяжоўваліся толькі фіксацыяй крыніцы без належнага аналізу агіяграфічных фактаў. У працы А. Тыртава [**5**] меліся спробы разгледзець факты біяграфіі Еўфрасінні, рэканструяваць яе шматгранныя сувязі з культурай старажытнарускага свету. Археалагічныя раскопкі, развіццё крыніцазнаўчай базы, поспехі ў тэорыі агіяграфіі на сённяшні дзень дапамагаюць больш дакладна вызначыць

напрамкі шматвектарнай дзейнасці Еўфрасінні, у тым ліку і ўдзел прападобнай у палітычным жыцці Полацкага княства.

Духоўны аўтарытэт Еўфрасінні быў вельмі вялікі ў Полацкім княстве не толькі па прычыне яе асветніцкай дзейнасці, але і яе высокага паходжання, згодна з тагачасным сярэднявечным статусам, з полацкага княжацкага роду нашчадкаў Рагвалода. Таму сцвярджэнне аб тым, што дзейнасць прападобнай ігуменні, уключаючы пабудову і аздабленне храмаў, не была абмежавана перапісваннем кніг і ўладкаваннем манастырскай гаспадаркі, будзе бездакорным і карэктным.

Манастыр Св. Спаса размяшчаўся ў непасрэднай блізкасці ад горада, таму цалкам адмовіцца ад свецкага жыцця з яго мірскімі клопатамі ігумення Еўфрасіння не мела магчымасці. З другога боку, сам манастыр не быў закрытай установай, а ўяўляў сабой культурны, адукацыйна-асветніцкі і сацыяльны цэнтр і таму не быў цалкам ізаляваны ад сучаснага яму грамадства пры любых умовах. Заснаваны не пазней за 1128 год у мястэчку Сяльцо, Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр стаў не толькі выдатным узорам самабытнай архітэктурнай спадчыны Полацкай школы дойлідства, але і важным цэнтрам палітычных і культурна-рэлігійных працэсаў гарадскога жыцця.

Була полацкай ігуменні, адкапаная ў Ноўгарадзе ў 1977 годзе, так званая пячаць № 121а памерам 20 мм, па словах акадэміка В.Л. Яніна, старажытны помнік сфрагістыкі, які па сваім выкананні з'яўляецца беспрэцэдэнтным узорам мастацкай работы і захаванасці. На адным баку размешчана пагрудная выява Еўфрасінні, на другім, што не мае аналагаў, шматфігурная кампазіцыя Праабражэння. Фармальныя прыкметы булы паказваюць на другую чвэрць — першую палову XII стагоддзя. У дадзеныя храналагічныя рамкі бытавання булы акрэсліваецца жыццядзейнасць Еўфрасінні Полацкай.

У 1993–1995 гадах быў знойдзены фрагмент пячаткі аналагічнага выгляду. Пасля былі раскрыты яшчэ дзве булы прападобнай ігуменні, якія мелі некаторыя адрозненні ў сваім вырашэнні. Віслыя пячаткі Еўфрасінні набліжаны па сваіх памерах да дыяметраў пячатак князёў удзельных княстваў Русі эпохі XII стагоддзя [**6**, с. 17–19].

Була належала манашцы, і тое, што гэтая манашка была Еўфрасіння Полацкая, мае пад сабой шмат грунтоўных доказаў і не можа быць аспрэчана. Спрэчнай стала наступнае меркаванне даследчыка: ігумення Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў перыяд прыняцця схімы пэўны тэрмін мела паўнату свецкай улады. Перыяд 30–50-х гадоў XII стагоддзя ў жыцці По-

лацкага княства атрымаў назву «Полацкі матрыярхат» [**7**, с. 17–19]. Многія даследчыкі абвяргаюць гіпотэзу «полацкага матрыярхата ў XII стагоддзі». На думку Л.В. Аляксеева, пасля высылкі ў Візантыю ў Полацку заставалася некалькі другарадных князёў, што ўжо нельга назваць матрыярхатам. Акрамя таго, у перыяд з 1132 па 1144 год на Полацкім стале сядзеў Васілька Святаслявіч [**8**, с. 58–59]. Адзначым, што і сам аўтар гіпотэзы паставіў пад сумненне факт матрыярхату і лічыў, што колькасць знойдзенага матэрыялу садзейнічае пакуль пастаноўцы праблем і не больш таго. У любым выпадку нельга не пагадзіцца са сцвярджэннем акадэміка В.Л. Яніна аб выключным становішчы ўладальніцы ўласнай пячткі ў палітычнай гісторыі Полацкага княства [**7**, с. 18]. Бясспрэчна адно: першая ігумення Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра адыграла важную ролю не толькі ў жыцці манастыра, але і дзяржавы.

Так, пасля разгрому княства кіеўскім князем Мсціславам Уладзіміравічам засталіся толькі жанчыны, але і яны былі за манастырскімі мурамі. Прадстаўнікі полацкай дынастыі, у тым ліку і бацька Еўфрасінні Святаслаў Усяславіч, былі сасланы ў Візантыю за ганебную адмову ўдзельнічаць у ваеннай кааліцыі супраць полаўцаў. Адразу пазначым, што падзеі 1129 года сталі знакавымі для грамадска-палітычнага ладу Полацкага княства: тагачасныя перамены ўнеслі пэўныя карэктывы ў прынцыпы замяшчэння на княскім прастоле.

Вядома, ігумення манастыра займалася духоўным удасканаленнем, працягвала займацца асветніцкай дзейнасцю: чытала пропаведзі-настаўленні, выкладала ў заснаванай пры абіцелі школе. Аднак прыналежнасць манашкі да княскага роду накладвала на Еўфрасінню і іншыя турботы, звязаныя з дзяржаўнымі праблемамі. Па меркаванні расійскага гісторыка В.Б. Перхаўкі, Еўфрасіння нават за манастырскімі сценамі мусіла захаваць рычагі палітычнай улады, няхай і адводзіла першаступеннае месца падзвіжніцкай дзейнасці [**9**, с. 193]. Зразумела адно: асабістая пячатка сведчыць аб непасрэдным адміністрацыйным кіраванні праз заключэнне гаспадарчых пагадненняў, зацвярджэнне афіцыйных дакументаў і г.д.

Так, з 1129 года Еўфрасіння засталася бадай што адзінай прадстаўніцай полацкай дынастыі на радзіме, якая мела дачыненне да афармлення афіцыйных дакументаў. Нават пасля ўладкавання на прастоле нашчадка Усяслава, які прыходзіўся ігуменні родным братам, Еўфрасіння ўсё ж працягвала прымаць непасрэдны ўдзел у вырашэнні палітычных канфліктаў

паміж князямі. Думаецца, што са згоды Еўфрасінні ў 1132 годзе, пасля смерці Мсціслава Вялікага, горад скінуў кіеўскага стаўленніка Святаполка Мсціславіча і абвясціў сваім князем роднага брата ігуменні Васільку Святаславіча. Варта адзначыць, што пры падтрымцы прападобнай княжны Еўфрасінні адбылося замірэнне полацкага князя Васількі з кіеўскім ўладаром Усеваладам Мсціславічам [**8**, с. 59].

Цяжка меркаваць, ці брала ўдзел Еўфрасіння ў вечавых сходах, але яе ўздзеянне на веча было вельмі значным. Князёўна мела вялікую вагу ў вырашэнні палітычных пытанняў. Як піша даследчык С.Л. Чаранін, «...менавіта княжацкае паходжанне дазваляла... манахіне праводзіць самастойную лінію дзейнасці, прычым уяўленне аб сваёй выключнасці ўваходзіла ў сістэму светапогляду Еўфрасінні: яна адчувала сябе «князёўнай царквы», не проста ігуменняй Спаскага манастыра, а ўсёй Полацкай зямлі» [**10**, с. 162].

Ігумення з'яўлялася носьбітам міратворчых ідэй, якія яна імкнулася пашырыць на палітычную дзейнасць княства, дзе наспявала міжусобная барацьба. Міратворчыя клопаты Еўфрасінні, што мелі на мэце патушыць міжусобныя спрэчкі Рагвалодавічаў, адлюстраваны ў царкоўных спевах, створаных у яе гонар у XII стагоддзі: «Князем сродником друг на друга дерзающе подъяти мечь возбранила еси, яко оружие обоюдоостро словесем божим устрашающем...» [**11**, с. 125]. Еўфрасіння Полацкая лічылася справядлівым суддзёй у грамадскіх і маральных справах, была прыхільніцай міру ў сваім і суседніх княствах.

Аднак галоўнае пытанне, якое нас турбуе, — схіма. Сам факт прыняцця Вялікай схімы прадугледжвае паўторную змену імя. Адзначым, што асоба, якая прымае вялікі анёльскі вобраз, атрымоўвае яшчэ аднаго заступніка-апекуна перад Богам. Вялікасхімнікі павінны жыць асобна ад браціі і акрамя няспыннай малітвы нічым больш не займацца. Вялікая схіма, «совершеннейшее отчуждение от мира для соединения с Богом», не прадугледжвае актыўны ўдзел манашкі ў грамадска-палітычным жыцці ні пад якім выглядам. Больш таго, у старажытнасці манахі давалі дадатковы абет — пайсці ў затвор і духоўна памерці для астатняга вонкавага свету, застаўшыся сам-насам з Богам. Аднак манашка, якой трэба быць адрачонай ад мірскога жыцця і абыякавай да праяў знешняга свету, карысталася пячаткай і змацоўвала дакументы, што ў Ноўгарадзе, Кіеве і Смаленску было выключна мужчынскай прэрагатывай. Як адзначаў а. Леў

Гарошка, «у новазаснаваным манастыры Еўфрасіння была і ігуменняю, і настаўніцаю, але перадусім была жывым прыкладам» [**12**, с. 62]. Цытуючы С.Л. Чараніна, Еўфрасіння «усведамляе сябе гаспадыняй у Полацку і права на гэта давала ёй княскае паходжанне» [**10**, с. 162]. Магчыма, Еўфрасіння магла прыняць схіму перад смерцю, аднак калі гэта і не было гістарычным фактам, традыцыя шанавання дазваляе адлюстраваць святога ў схіме. Тут варта правесці паралелі паміж прападобным Трыфанам Вяцкім (1546–1612) і полацкай ігуменняй. Як сцвярджае даследчыца культу прападобнага Трыфана І.А. Чурына, рабілася гэта з непасрэднай мэтай паглыбіць тэму манаскага подзвігу і аскезы [**13**, с. 123]. Пакуль пытанне прыняцця схімы святой застаецца адкрытым.

У дысертацыйным даследаванні «Княгини древней Руси X — первой половины XIII вв.: социальный статус и роль в государственной политике» [**14**] расійскі гісторык С.Г. Палякова, прааналізаваўшы комплекс гістарычных крыніц, вызначыла галоўныя крытэрыі, згодна з якімі жанчына княжацкага паходжання мела ўсе неабходныя правы для дзяржаўнага кіравання. Так, для непасрэднага ўдзелу ў адміністрацыйнай дзейнасці неабходна наяўнасць наступных умоў: *належная адукацыя, маёмасная самастойнасць, высокі статус жанчыны-маці і актыўны ўдзел у асветніцкай дзейнасці*. Разгледзім ступень уключэння асобы Еўфрасінні Полацкай у свецкае жыццё княства згодна з прыведзенымі пунктамі.

Абапіраючыся на звесткі Жыція, Еўфрасіння атрымала якасную адукацыю, неабходную для прыняцця адэкватных рашэнняў: «вести же разшедшейся по всем градом о мудрости ея и о блазем учении ея и о телесной утвари… многия славныя князи на любление приведе ко отцу ея…» [**15**, с. 173].

Як падкрэслівае даследчыца С.Г. Палякова, княжны і княгіні, прыняўшыя манаскі пострыг, працягвалі і надалей захоўваць правы валодання і распараджэння рухомай і нерухомай маёмасцю. Так, у Жыціі Еўфрасінні Полацкай распавядаецца аб перадачы ў маёмасць Сяльца, што знаходзілася каля Полацка. Як вядома, полацкая княжна атрымала ад епіскапа Іліі ў дар мястэчка Сяльцо «идеже братья наша лежат преже нас бывшии епископы» [**15**, с. 174]. На вызначанай плошчы, падуладнай полацкім архірэям, размяшчаліся храм-пахавальня і драўляная Спаская царква. Акт перадачы загараднай рэзідэнцыі полацкіх епіскапаў, якая знаходзілася за 2 км ад полацкага дзядзінца, быў заключаны на належным дзяржаўным узроўні.

Еўфрасіння атрымала права валодаць вызначанай маёмасцю, і гэта адчувальна паўплывала на незалежную лінію яе далейшых паводзінаў: заснаванне двух манастырскіх комплексаў, набыццё іконы Эфескай Багародзіцы, замова славутага крыжа-рэлікварыя. Змешчаныя ў крыжы святыні былі прывезены падчас дыпламатычнага падарожжа ў Візантыю «слугі» Еўфрасінні Полацкай Міхаіла, які, як лічыць даследчык жыццяпісу А.А. Мельнікаў, быў накіраваны самой ігуменняй з асабістай дыпламатычнай місіяй [**16**, с. 176].

Даследчыца ўзгадавае высокі статус жанчыны-маці, якая магла быць рэгентам пры малалетнім спадчынніку княскага стала ў выпадку смерці мужа. Што датычыцца ігуменні Еўфрасінні, то яе таксама можна параўнаць з маці: «Сице же и всегда учаще и безпрестани, яко мати чадолюбивая к детем своим любовь показующи» [**15**, с. 176]. Ёсць меркаванні, што прападобная колькі год была непасрэдным выхавацелем і рэгентам князя Васількі, якому пашчасціла пазбегнуць высылкі 1129 года дзякуючы манастырскім сценам.

Удзел полацкай ігуменні ў асветніцкай дзейнасці безумоўны. Беларускія даследчыкі В. Чамярыцкі і М. Ермаловіч меркавалі, што полацкая ігуменя прычынілася да стварэння мясцовага летапісу, які знік падчас Лівонскай вайны (1558–1583), і з'яўлялася аўтарам двух манастырскіх статутаў [**17**, с. 139]. Той факт, што Еўфрасіння сама пісала літаратурныя творы, пакуль не абгрунтаваны і не мае бясспрэчных доказаў.

Заснаваннем манастыроў, школ, іканапісных і ювелірных майстэрань Еўфрасіння вызначыла сябе збіральніцай талентаў і тым самым набыла вялікі аўтарытэт на палітычнай арэне княства. Культурна-асветніцкая дзейнасць полацкай княжны, прыняўшай манаскі чын, застаецца неацэннай. Высокаадукаваная ігумення, якая ведала кіраўніцтвам двух манастыроў, надала развіццю адукацыйнага працэсу моцны штуршок. М. Лаўроўскі для пацвярджэння сваёй думкі аб развіцці адукацыі ў Старажытнай Русі спасылаецца на некаторыя факты з жыцця Еўфрасінні. Так, ён трактуе эпізод аб стварэнні школы прападобнай княжной у Полацкай зямлі як якасна новы этап у «адукацыйнай дзейнасці на Русі» [**18**, с. 17–18]. Больш таго, аўтар акцэнтуе ўвагу на тым, што вывучаць грамату было адным з абавязкаў інакінь. Еўфрасіння ўзгадваецца разам са славутай кіеўскай князёўнай Ганнай Усеваладаўнай, стваральніцай школы пры манастыры.

Трэба пагадзіцца са словамі расійскага даследчыка Л.В. Аляксеева, што Еўфрасіння не замыкалася ў манаскім кансерватызме. Да прыкладу,

наватарскія ідэі дойліда Іаана толькі заахвочваліся prapадобнай. Як перадавая жанчына свайго часу, яна ўсведамляла, што інавацыйныя думкі яе сучаснікаў падкрэслівалі таксама і яе ўласныя ідэі і погляды. У манаграфіі «Палітычная і прававая думка Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX — пачатак XXI стст.)» даследчык І.У. Вішнеўская пазначыла перш за ўсё гуманістычную сутнасць палітычнага светапогляду полацкай асветніцы [**19**, с. 17–18].

Калі разглядаць асобу Еўфрасінні Полацкай у палітычным жыцці княства згодна з вышэй прапанаванымі крытэрыямі, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што полацкая княжна-ігуменння праявіла сябе як высокаадукаваная жанчына свайго часу, якая валодала ўсімі якаснымі дадзенымі для вырашэння вострых пытанняў грамадска-палітычнага характару.

На першы погляд, манашка не магла мець права голасу на міжнародна-палітычнай арэне княства. Такія фактары, як высокае паходжанне і памеры пасагу, перададзенага ў манастыр, не павінны былі вызначаць яе ролю ў грамадска-палітычным жыцці. Аднак прымаючы да ўвагі высокае свецкае і духоўнае паходжанне (сан княжны і ігуменні быў сацыяльна значным), ініцыятыўнасць і роднасныя сувязі з княскім домам, члены якога былі і патэнцыяльнымі фундатарамі ў шматлікіх пачынаннях, можна сцвярджаць, што ўплыў Еўфрасінні на палітычны курс Полацкага княства відавочны.

### Спіс літаратуры і крыніц

1. *Довгялло, Д.И.* Крест преподобной Ефросинии, княжны Полоцкой: (исторический эскиз) / Д.И. Довгялло. — Витебск: Губернская типография, 1895. — 25 с.

2. *Дубровский, М.* Житие преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой, с кратким описанием основанного ею в г. Полоцке женского монастыря и находящейся в нём святыни / Михаил Дубровский. — Полоцк: издание Полоцкого церковного братства во имя св. Николая и пр. Евфросинии, княжны Полоцкой, 1885. — 34 с.

3. *Сапунов, А.П.* Полоцкий Спасо-Ефросиньевский девичий монастырь / А.П. Сапунов. — Витебск, 1888. — 11 с.

4. *Сапунов, А.П.* Житие преп. Ефросинии, княжны Полоцкой / А.П. Сапунов. — Витебск, 1888. — 11 с.

5. *Тыртов, А.П.* Некоторые пояснения к описанию жития преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой / сост. А.П. Тыртов. — Витебск: Губ тип., 1893. — 25 с.

6. Полоцкое Радование: Свято-Евфросиниевские Торжества 1910 года / [редактор А.Г. Борисова-Горюнова; художник А.П. Маковцов]. — Полоцк: Свято-Евфросиниевский женский монастырь в г. Полоцке Полоцкой епархии Белорусской Православной Церкви, 2010. — 437 с.

7. *Янин, В.Л.* Полоцкий матриархат / В.Л. Янин // Знание — сила. — 1970. — № 2. — С. 17–19.

8. *Алексеев, Л.В.* Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры: в 2 кн. / Л.В. Алексеев; Ин-т археологии РАН. — М.: Наука, 2006. — Кн. 2. — 2006. — 167 с.

9. *Перхавко, В.Б.* Князья и княгини Русской земли IX–XVI вв. / В.Б. Перхавко, Е.В. Пчелов, Ю.В. Сухарев. — М.: Русское слово, 2002. — 476 с.

10. *Чаранін, С.* Дзейнасць Еўфрасінні Полацкай і ўзаемаадносіны асветніцы з царкоўнымі ўладамі / С. Чаранін // 480 год беларускага кнігадрукавання: матэрыялы трэціх Скарынаўскіх чытанняў.— Мінск: Бел навука, 1998. — С. 162.

11. *Серегина, Н.С.* Песнопения русским святым / Н.С. Серегина // М-во культуры Рос. Федерации, Рос. АН, Рос. ин-т истории искусств. — СПб.: РИИИ, 1994. — С. 123 — 133.

12. *Гарошка, Л.* Св. Ефрасіння-Прадслава, ігумення манастыра св. Спаса ў Полацку, патронка Беларусі / Л. Гарошка. — Парыж: Выд. Беларус. рэлігійнай місіі, 1949. — 79 с.

13. *Чурина, И.О.* Культ православного просветителя финно-угорских племен преподобного Трифона Вятского как историко-культурный феномен: дис. ...канд. ист. наук: 07.00.02 / И.О. Чурина. — Санкт-Петербург, 2008. — 351 л.

14. *Полякова, С.Г.* Княгини Древней Руси X — первой половины XIII вв.: социальный статус и роль в государственной политике: дис. ...канд. ист. наук: 07.00.02 / С.Г. Полякова. — Брянск, 2006. — 294 л.

15. Памятники старинной русской литературы, издаваемые графом Григорием Кушелевым-Безбородко. Вып. 4: [Повести религиозного содержания, древние поучения и послания, извлеченные из рукописей Николаем Костомаровым]. — 1862. — 221 с. Повесть о Евфросинии Полоцкой. С. 172–179.

16. *Мельников, А.А.* Преподобная Евфросиния Полоцкая / А.А. Мельников. — Минск: Четыре четверти, 1997. — 112 с.

17. *Варатнікова, А.А.* Гістарыяграфічныя звесткі пра Ефрасінню (Прадславу) Полацкую. Помнікі культуры / А.А. Варатнікова // Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. — Мінск: Навука і тэхніка, 1985. — С. 139–142.

18. *Лавровский, Н.А.* О древнерусских училищах / Н.А. Лавровский. — Харьков: Унив. тип., 1854. — 189 с.

19. *Вішнеўская, І.У.* Палітычная і прававая думка Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX — пачатак XXI стст.) / І.У. Вішнеўская. — Мінск: Тэсей, 2008. — 295 с.